# Беларускія мастакі “Парыжскай школы”

***Парыжская школа*** – умоўнае абазначэнне для некалькіх пакаленняў інтэрнацыянальнага згуртавання мастакоў, якія жылі і стваралі ў Парыжы з 1900 да 1960-х гадоў. Звычайна іх падзяляюць на прадстаўнікоў трох перыядаў:

1900—1920-я (жыхары квартала Манпарнас — Пікасо, Шагал, Мадзільяні, Паскін, Суцін),

міжваеннае дваццацігоддзе (Ланской, Палякоў, прадстаўнікі абстрактнага мастацтва),

вайна і пасляваенныя годы, пачынаючы з накіраванай супраць фашысцкага рэжыму Вішы выставы «Дваццаць маладых мастакоў французскай традыцыі», арганізаванай у 1941 Жанам Базенам (Манесье, Эстэв, Фужарон і інш.) да 1960-х гадоў. Майтсроў двух апошніх перыядаў часам называюць «Новай Парыжскай школай».

Сам тэрмін «Парыжская школа» увёў у 1925 г. мастацкі крытык Андрэ Варно ў кнізе «Калыбель маладога жывапісу: Парыжская школа».

Парыжская школа — не накірунак, не метад і не стыль. Так называюць групу мастакоў з усяго свету, якія накіраваліся ў Парыж у пачатку XX ст. менавіта Парыж дапамог кожнаму з іх знайсці сваю творчую манеру.

Пастаянныя стасункі мастакоў, узаемная падтрымка і ў той жа час непаразуменні стваралі ўнікальныя ўмовы творчага спаборніцтва. Тут перапляталіся біяграфіі, з’яўляліся шматлікія новыя накірункі. Мастацкая інфармацыя распаўсюджвалася імкліва, і можна зразумець, чаму сітуацыя ў мастацтве змянялася часам на працягу месяцаў.

**Міхаіл Кікоін** – хлопец з Паўночна-Заходняга краю дасягнуў неймавернага поспеху ў Еўропе. Нарадзіўся 31 траўня 1892 г. у Рэчыцы (Беларусь). Памёр 4 лістапада 1968 г. у Канах (Францыя).

Міхаіл Кікоін нарадзіўся ў габрэйскай сям’і. На зломе 19 і 20 стагоддзяў у Рэчыцы жылі блізу 10 тысяч чалавек, 57,5% з якіх складалі габрэі. Зрэшты, падобная сітуацыя была ў большасці беларускіх гарадоў і мястэчак. Кікоін-старэйшы працаваў у гомельскім банку, што гарантавала сям’і дабрабыт. Менавіта сацыяльны статус адрозніваў хлопчыка ад многіх сяброў-жабракоў. Праўда, кажуць, Міша ніколі не хваліўся сваім “багаццем” і заўжды дапамагаў прыяцелям чым мог.

Ужо ў дзяцінстве ён выявіў выразны талент да малявання, і ў 13 год рэчыцкі падлетак выпраўляецца ў Мінск. Бацька ўладкоўвае сына ў платную гімназію. Сам Міша імкнецца да пэндзля ды запісваецца ў вядомую на той час малявальную школу Якава Кругера — папулярнага ў Мінску партрэтыста, які ў свой час вучыўся мастацтву ў Кіеве, Варшаве, Пецярбурзе ды Парыжы. У студыі Кругера Кікоін і пазнаёміўся са смілавіцкім хлопцам Хаімам Суцiным, які быў на год меншы за яго. Нягледзячы на розніцу ў паходжанні (Суцін быў малодшым з дзевяці дзяцей ў бядняцкай сям’і), яны сталі найлепшымі сябрамі.

У той час адной з найлепшых мастацкіх вучэльняў Расійскай імперыі лічылася Віленская малявальная школа акадэміка Івана Трутнева. У 1909 годзе

Віленскае іудзейскае таварыства заахвочвання мастацтва, якое вышуквала таленавітых габрэйскіх падлеткаў з усёй імперыі, запрасіла Кікоіна і Суціна ў Вільню. Калі Хаім амаль не падтрымліваў стасункаў з сямейнікамі, то Міхаіл скіраваўся ва "ўсходнееўрапейскі Іерусалім" насуперак волі бацькоў.

У старадаўняй сталіцы Вялікага княства Літоўскага сябры жылі коштам мясцовай габрэйскай абшчыны, а вось у Трутнева навучаліся бясплатна. Там яны сустрэлі яшчэ аднаго земляка з Паўночна-Заходняга краю — выхадца з мястэчка Жалудок пад Шчучынам Пінхаса Крэменя. Ён быў старэйшым на некалькі гадоў ды стаў сярод іх нефармальным лідарам.

Удзень і ўначы гэта тройца думала аб адным — патрапіць у цэнтр еўрапейскай культуры — Парыж, дзе яны здолеюць спраўдзіць свае мары ды выбіцца ў людзі. Першым скараць Парыж адпраўляецца Крэмень. Следам за ім у 1911 годзе (паводле іншай інфармацыі, у 1912-м) едзе Міхаіл Кікоін.

Выхадзец з Беларусі адразу пасяляецца ў легендарным "Вуллі" (La ruche). Такі назоў меў комплекс са 140 мастацкіх студый на паўднёва-заходняй ускраіне Парыжа, якія французскі мецэнат Альфрэд Бушэ здаваў маладым мастакам і літаратарам. Месячная арэнда майстэрні каштавала, як два серадняцкія абеды, а сярод насельнікаў "Вулля" былі легендарныя сёння імёны: Лежэ, Мадзільяні, Шагал, Апалінэр, Рывера, Цадкін, Крэмень...

Калі ў 1913-м на перон Парыжскага вакзала сышоў Хаім Суцін, які ні слова не ведаў па-французску, яму хапіла двух словаў: "Манпарнас" і "Кікоін". Сябры сустрэліся, і ў адзін з першых вечароў пайшлі ў тэатр на "Гамлета". Паводле легенды, пасля спектакля Суцін сказаў: "Калі ў такім горадзе мы не здолеем раскрыцца, не зможам стварыць вялікіх твораў, грош нам цана".

Сёння Кікоіна, Суціна і Крэменя ведаюць як найяскравых прадстаўнікоў гэтак званай Парыжскай школы.

"Парыжская школа налічвала, можа, паўтары тысячы мастакоў з усяго свету, якія развівалі эксперыментальныя кірункі жывапісу — кубізм, экспрэсіянізм, дадаізм, сюррэалізм", — распавядае ўладальнік найбуйнейшай прыватнай галерэі Масквы Аляксандр Хачынскі. Ён сабраў багатую калекцыю карцін выхадцаў з Беларусі, якія здабылі сусветную славу ў якасці выхаванцаў Парыжскай школы.

"У пошуках лепшага жыцця, творчай волі і жадання рэалізаваць свой талент яны пасяліліся ў парыжскім раёне Манпарнас. Адны атрымалі адукацыю ў Францыі, іншыя, самародкі, нідзе не вучыліся. Багатыя і паспяховыя дапамагалі бедным і невядомым. Яны дзялілі жыллё, ежу, выпіўку і жанчын. І сярод іх было нямала выхадцаў з Беларусі", — сцвярджае расійскі калекцыянер.

Атабарыўшыся ў "Вуллі", Кікоін каля года вучыцца ў Нацыянальнай школе вытанчаных мастацтваў Фернана Кармона. У розныя гады школу ветэрана французскага рэалізму прайшлі вялікія Тулуз-Латрэк, ван Гог, Рэрых…

Каб зарабіць на пражыццё, Кікоін займаўся фотарэтушшу, супрацоўнічаў з папулярным у літаратурна-мастацкіх асяродках часопісам "Махмадзім", які выдаваўся па-французску і на ідыш.

Маючы таварыскія адносіны з Мадзільяні і Шагалам, у творчасці Міхаіл Кікоін найбольш запазычыў у Сезана, Банара і свайго сябра Суціна. Сын гомельскага банкіра працаваў над пейзажамі, партрэтамі, нацюрмортамі і ню — эфектна маляваў колерам, імкнучыся перадаць драматургію праз простыя формы.

З пачаткам Першай сусветнай наш зямляк нечакана для людзей ягонага кола ідзе дабравольцам у французскую армію, у шэрагах якой служыць да канца вайны. Пры першай мажлівасці ён вяртаецца да пэндзля.

Кікоін досыць паспяхова экспанаваўся ў вядомых парыжскіх салонах — “Восеньскім” і “Незалежных”, неаднаразова ладзіў персанальныя выставы ў Парыжы (першая — у 1917 годзе), Манпелье, Нью-Ёрку, Лондане...

У 1924 годзе мастак з Беларусі атрымлівае французскае грамадзянства. У той час ягоныя працы ўжо паспяхова прадаюцца ў галерэях і салонах. Ашчадзіўшы грошы, Мішэль Кікоін нарэшце набывае вясковую хату ў Бургундыі, куды ездзіў працаваць цягам доўгіх гадоў.

У 1927-м Кікоін пасяляецца ў Манружы, пад Парыжам, назаўжды вылятаючы з “Вулля”. Яшчэ праз шэсць год ужо вядомы майстар набывае прасторную майстэрню ў культавым Манпарнасе, дзе працуе да канца жыцця.

У 1928-м карціны Мішэля Кікоіна былі прадстаўленыя на выставе сучаснага французскага мастацтва ў Маскве. Праўда, сам мастак у краіну Саветаў ехаць не рашыўся ні тады, ні пасля.

Цікава, што за “жалезнай заслонай” гучала імя іншага Кікоіна — ягонага стрыечнага брата Ісака. Той быў выбітным фізікам, адным з асноўных навукоўцаў, якія працавалі ў СССР над "атамным пытаннем". Залішне казаць, што ніякіх кантактаў браты не трымалі.

Жыццё Міхаіла Кікоіна скаланулася падчас нямецкай акупацыі Францыі, калі мастак разам з жонкай-віленчанкай і двума дзецьмі трапілі ў канцлагер. Ад непазбежнай смерці іх выратавала вызваленне з боку войскаў Саюзнікаў.

Па вайне мастак багата падарожнічае па Еўропе, тройчы наведвае Ізраіль. Актыўна працуе, адкрываючы персанальныя выставы ў Францыі, Англіі, ЗША. З 1958-га творца канчаткова атайбаваўся ў Канах.

Сэрца Мішэля Кікоіна спынілася на 77-м годзе жыцця на віле дачкі на Лазурным беразе.

Справу бацькі працягнуў сын Янкель. Аўтарытэтны геолаг, ён ужо ў сталым узросце пачаў калекцыянаваць жывапіс, а потым і маляваць. Жак Кікоін меў уласныя выставы ў Парыжы, Ізраілі і Амстэрдаме, выкладаў у мастацкай акадэміі.

За год да смерці Міхаіл Кікоін напісаў партрэт старога сябра Хаіма. Суцін пражыў значна карацейшае і шмат больш трагічнае жыццё. Аднак магутнасцю свайго талента захінуў даробак сяброў.

Менавіта таму лічыцца, што Кікоін, які за паўстагоддзя напісаў больш за 2,5 тысячы карцін, недаацэнены і дагэтуль не карыстаецца асаблівай папулярнасцю сярод калекцыянераў. Дзеля параўнання, за апошняе дзесяцігоддзе цана на карціны Суціна падскочыла да мільёнаў і мільёнаў

доллараў. Самая ж дарагая праца Кікоіна “Ляжачая” пайшла з малатка за 80 тысяч еўра.

Аднак так выглядае толькі звонку. Тыя ж, хто ведаў абодвух сяброў, сцвярджалі, што “віна” Кікоіна палягала адно ў тым, што ён быў не геніем, а проста таленавітым мастаком.

**Суцін, Хаім Саламонавіч** (13 снежня 1893, Смілавічы Мінскай губерні, Беларусь – 9 жніўня 1943, Парыж, Францыя) — беларускі мастак яўрэйскага паходжання. Хаім Суцін нарадзіўся ў беднай яўрэйскай сям’і, і был дзесятым з адзінаццаці дзяцей. Бацька яго працаваў партным. З ранняга дзяцінства Хаім праяўляў любоў да малюнку і жывапісу.

У 1907 г., дзеля таго, каб вызваліцца ад уплыву сям’і (бацькі не падтрымлівалі сына наконт будучай кар’еры мастака) і не змяніць свайму прызванню, Хаім збягае з дому ў Мінск. Там ён наведвае лекцыі малюнка у Якава Кругера, дзе знаёміцца з М.Кікоіным.

У 1910 г. Суцін і яго сябр Міхаіл Кікоін едуць у Вільна, дзе запісваюцца ў Школу вытанчаных мастацтваў. Будучыя мастакі мараць аб Парыжы.

У чэрвені 1913 г. малады мастак з маленькага невядомага мястэчка пад Мінскам прыязжае ў Парыж. Пра гэты горад ён марыў, туды імкнуўся, там жадаў праславіцца. Магутная Руская імперыя была для яўрэйскага хлопца краінай цяжкай і жорсткай. Але Суцін любіў яе, бачыў яе бездапаможнасць, наіўнасць, хаця ніколі не апяваў яе падобна Шагалу. З Шагалам Суціна звязваў незвычайны рамантызм натуральнасці. Калі Шагал ствараў свае мілыя казкі, то Суцін быў у мастацтве Шэкспірам, які смела выкарыстоўвае трагедыйныя фарбы.

Суцін прыязжае ў Парыж, дзе запісваецца ў атэлье Кармона ў акадэміі вытанчаных мастацтваў. За гучнай назвай хавалася прыватная школа. Прычым платная. Грошаў у Суціна не было. Ён падпрацоўваў, грузіў вагоны і баржы. Яго сябр Мадзільяні выдаваў яму адзін франк на дзень. Затым яны разам напіваліся ў танных кафэ. Суцін засыпаў за столікам ці на старым ложку ў выпадковай сяброўкі. Раніцай Суцін зноў браўся за працу. Пісаў ён свае халсты бурна, эмацыянальна, выкладваючыся да канца. Адыходзіў ад мальберта, калі ўжо ногі яго не трымалі.

Аднак Суцін вельмі хутка мяняе залішне «акадэмічную» Акадэмію на наведванні Луўра, які становіцца для яго сапраўдным універсітэтам. Тут ён вывучае прызнаныя творы класікаў жывапісу, грэчаскую і егіпецкую скульптуру, карціны Гойі, Эль Грэка, Цінтарэтта, Жана Фуке, Рэмбрандта, Каро, Шардэна. З сучаснікаў Суцін больш за ўсіх лічыў вартым Курбэ і Сезана. Суцін цікавіўся музыкай і літаратурай. Сярод яго любімых аўтараў былі Мантэнь, Расін, Сенека, Дастаеўскі, Пушкін, Бальзак, сярод кампазітараў – Бах і Моцарт. Першыя гады ў Парыжы мастак жыве ў беднасці. Пэўны час Суцін жыве і працуе ў «Ла Руш», («Вулле»), міжнародным інтэрнаце бедных мастакоў на левым беразе Сены, які быў створаны ў 1902 г. скульптарам Альфрэдам Бушэ. Тут Суцін пазнаёміўся з Маркам Шагалам, Фернанам Лежэ, Раберам Дзеланэ, скульптарамі Канстанцінам Брынкушы, Восіпам Цадкіным, Анры

Ларанам, Ліпшыцам і Аляксандрам Архіпенка. Менавіта тут ён пазнаёміўся і са сваім верным сябрам Амадэа Мадзільяні.

У 1918 г. ён пераязжае на поўдзень Францыі (Ванс, Кан-сюр-Мер і Серэ). Яго ўражвае прыгажосць мясцовых пейзажаў, ён працуе некалькі год у вельмі хуткім тэмпе.

У 1922 г. прывозіць у Парыж каля двухсот напісаных работ. Амерыканскі калекцыянер Альберт Барнс набывае ў мастака каля пяцідзесяці твораў. У наступным годзе гандляр творамі мастацтва Леапольд Збароўскі прадае шмат палоцен Суціна. Праз 10 год пасля прыбыцця ў Парыж Суцін выбіраецца з беднасці і траціць усё, што зарабляе.

Але са з’яўленнем грошаў Суцін мала мяняецца: ён быў не вельмі акуратны, быў вельмі сціплы ў асабістых адносінах. Але сябры клапаціліся пра яго, апранулі яго, навучылі добрым манерам, арэндавалі яму нармальнае жыллё.

У 1925 г. пасля сямі год, праведзеных на поўдні Францыі, Суцін вяртаецца ў Парыж, дзе пасяляецца ў атэлье на вуліцы Мон Сен-Гатар, недалёка ад плошчы Данфер-Рашро. Менавіта тут ён выканае серыю тушаў быкоў і шматлікія нацюрморты з рыбай і птушкай.

Адразу кідаліся ў вочы яго адрозненні ад іншых – асаблівая напружанасць, незвычайныя манеры, нескладныя рухі. Затое мастацкі інстынкт у яго быў настолькі моцным, што маляванне ўводзіла яго далёка ад рэальнасці, у чароўны свет фантазіі, выдумкі, уяўлення. Калі ён маляваў, розум нібы зусім пакідаў яго – нічога не бачыў, нічога не чуў, нічога не разумеў… У яго карцінах адлюстроўваліся асоба і душа мастака. Яны былі каларытны, шматзначны, бязмежна выразнымі. Ён увасабляў праўду асабістых пачуццяў з такой сілай, што да гэтага часу здзіўляе людзей непадробным драматызмам.

У 1927 г. адбылася першая персанальная выстава Суціна ў адной з парыжскіх галерэй. Тут ён знаёміцца з Марселенам і Мадлен Кастэн, якія разам са Збароўскі бяруць апеку над мастаком. У 1929 г. Суцін пазнаёміўся з гісторыкам мастацтваў Элі Форам, які напіша першую манаграфію, прысвечаную яго творчасці.

У 1935 г. творы мастака ўпершыню выстаўляецца ў ЗША у межах калектыўнай выставы ў Чыкага. У 1937 годзе 12 карцін мастака трапляюць на калектыўную выставу “Майстры незалежнага мастацтва 1895 – 1937” ў Дзяржаўным музее Пты Пале ў Парыжы. Тут Суцін знаёміцца з Гердай Грот, немкай, якая хаваецца ад нацыскага рэжыма; яна будзе яго сяброўкай тры гады. У 1939 г. Суцін ад’язжае ў Йонн. А ў 1941 г. пасля няўдалых спроб атрымаць права на ўезд у ЗША пера’язжае ў Шампіны.

Суцін быў па-дзіцячы даверлівым, верыў у сябе, свае рукі, як і яго бацька, які мог пашыць касцюм любому капрызнаму тырану. Для Суціна яго работа жывапісца была галоўным і адзіным законам жыцця.

Без стамлення Суцін пісаў мясныя тушы, птушку, рыбу на талерцы, цыплят. Ні ў аднаго мастака не было столькі работ, звязаных з ежай. Гэты чалавек добра нагаладаўся. Ён памёр 9 жніўня 1943 года ў Парыжы ад перытаніта. Горад быў акупіраваны. Зберагаючыся ад нямецкай паліцыі, многія

сябры не маглі выйсці на вуліцу і ў апошні шлях Суціна праважаў толькі адзін чалавек. Гэта быў Пікасо. Пахавалі Суціна на могілках на Манпарнасе.

Дакладна можна прылічыць гэтага майстра да *чароўнага рэалізму*. Гэта непаўторны індывідуальны стыль, усхваляванае пісьмо, накалены дабела жывапіс, бясконцая экспрэсія, калі пэнзаль стварае на халсце не экзерсісы, а сапраўдную музыку.

У Суціна не было духоўнага пакою. Творчасць спаліла яго. З пэнзалем у руцэ ён быў незвычайна прасветлены. Гэта пра такіх пісаў мудры Пушкін: «И сердце вновь горит и любит оттого, что не любить оно не может».

**Пінхус Крэмень** (28 ліпеня 1890 года, Жалудок, блізу Ліды, Беларусь - 5 красавіка 1981, Серэ, Усходнія Пірэнеі, Францыя) - беларускі мастак Парыжскай школы. Акрамя жывапісу, займаўся таксама скульптурай і графікай.

Нарадзіўся ў габрэйскай сям'і, бацька - рамеснік. У 1909 - 1910 гг. вучыўся ў мастацкай школе ў Вільні, дзе пазнаёміўся з Суціным і Кікоіным. У 1912 пасяліўся ў Парыжы, у інтэрнацыянальным інтэрнаце мастакоў «Вулей» (па-французску - La Ruche). Пазнаёміўся з Шагалам, Лежэ, Цадкіным, Мадзільяні.

У 1914 г. выставіў тры скульптурныя працы ў Салоне незалежных. У Першую сусветную вайну жыў у Парыжы. У гэты перыяд яго карцінамі пачалі цікавіцца парыжскія калекцыянеры (Поль Гіём, Леапольд Збароўскі). У 1918 г. пасяліўся ў Серэ, прыязджаў у Парыж, у 1920-я гады шмат падарожнічаў (Корсіка, Швецыя). Другую сусветную вайну правёў на поўдні Францыі, у дэпартаменце Карэз, быў наёмным работнікам у вёсцы. У 1945 г. пасяліўся ў Серэ. Пабудаваў дом, куды часта прыязджалі сябры-мастакі, ладзіў у ім выставы авангардыстаў. «Пейзаж у Серэ» адносіцца да 1960-м гадоў, калі Крэмень пераехаў у гэты маленькі гарадок, размешчаны ў французскіх Пірэнеях. Там мастак правёў апошнія дваццаць гадоў жыцця і працягваў ствараць карціны ў стылістыцы, характэрнай для жывапісу 1910-х гадоў: фактура яго твораў адчуваецца як нейкая пластычная маса, «лепячы» паверхню. Каларыт «Пейзажу ў Серэ» пабудаваны на напружаных кантрастах чырвона-аранжавай зямлі і сіне-зялёных з акцэнтамі фіялетавых колераў неба, з характэрнымі экспрэсіўнымі чорнымі мазкамі, акрэсліваюць формы гор на гарызонце, пейзажныя планы.

Пахаваны ў Парыжы на могілках Манпарнас.

Пры жыцці мастака яго персанальныя выставы не раз праходзілі ў Парыжы, а таксама ў Лондане, Філадэльфіі, Лазане, Жэневе і інш. У 2005 некалькі яго работ экспанаваліся ў Маскве (галерэя «Вулей» і інш.)

**Любіч Восіп** (Іосіф) (1908 - 1990) - мастак беларускай эміграцыі, прадстаўнік парыжскай школы жывапісу. Працаваў у галіне пейзажу, партрэта, жанравага жывапісу, займаўся афортам. Нарадзіўся ў г. Гродна, Беларусь. Восіп Любіч, скончыўшы гімназію ў Гродне, паступіў у Адэскае мастацкае вучылішча. У 1920 разам з І. Пуні і П. Чалішчавым (рускія мастакі) выехаў у Берлін, працаваў дэкаратарам у Берлінскай оперы, афармляў спектаклі тэатра-

кабарэ "Сіняя птушка" і тэатра І. Дувана-Тарцова. Акрамя прафесійнага занятка, якое не заўсёды прыносіла хлеб, ён падзарабляў статыстам, іграў на скрыпцы ў кінатэатрах, рабіў усё для таго, каб выжыць і пры гэтым займацца любімай справай. У 1923 пераехаў у Парыж, дзе А. Бурдэль увёў яго ў салон Цюільры. Любіч атрымлівае заказ на афармленне парыжскага кабарэ на Манмартры і селіцца ў квартале Манпарнас. Будучы ў сталіцы, якая славілася як заканадаўца мод, ён вывучае працы Рэмбрандта, Гойі і Дэга.

З 1923 г. - пастаянны экспанент выстаў у мастацкіх галерэях Парыжа, Цюрыха, Бруселя, Лондана. Падчас Другой сусветнай вайны быў арыштаваны і адпраўлены ў канцлагер Дрансі, Францыя, у 1944 арганізаваў ўцёкі, дзякуючы чаму застаўся ў жывых. Захаваліся малюнкі майстра, на якіх намаляваныя сцэны паўсядзённага жыцця ў лагеры. У 1945 працы мастака экспанаваліся на Выставе сучасных жывапісцаў і скульптараў, арганізаванай камітэтам "Францыя - СССР" XIV акругі Парыжа. Работы знаходзяцца ў многіх французскіх музеях, а таксама ў музеях Лондана, Цюрыха, Нью-Ёрка, Тэль-Авіва, шэраг гравюр захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Парыжы.

Пейзажы, партрэты, жанравыя карціны і нацюрморты, афорты ... Мастак працуе алеем і гуашшу, займаецца гравюрай. Нічога не пакідае для сябе, выстаўляецца ў Нацыянальным музеі Бецалель у Ерусаліме, у Мілане, Турыне (1953) і Нью-Ёрку. Удзельнічае ў групавых і персанальных выставах, у тым ліку выставах «Рускія мастакі Парыжскай школы» у Музеі Сен-Дэні і ў Доме французскай думкі ў Парыжы, у галерэі «Motte».

Сёння палатна Восіпа Любіча захоўваюцца ў музеях французскай правінцыі, а таксама ў музеях Лондана, Цюрыха, Нью-Ёрка і Тэль-Авіва. Гравюры знаходзяцца ў сходзе Нацыянальнай бібліятэкі ў Парыжы.

**Шрага Файбіш Зарфін** (1899 - 1975, псеўданім - Сэм Царфін), нарадзіўся ў мястэчку Смілавічы, непадалёк ад Мінска. Пачатковую мастацкую адукацыю атрымаў у віленскай школе вытанчаных мастацтваў, дзе вучыліся таксама Суцін, Кікоін, Крэмень. У 1914 г. Зарфін эміграваў у Палестыну. У Ерусаліме ён вучыўся ў Акадэміі мастацтваў Бецалель. У 1923 г. Зарфін з'ехаў у Берлін, дзе на яго аказалі ўплыў Макс Ліберман і нямецкія экспрэсіяністы. У 1924 г. пераехаў у Парыж і зноў сустрэўся з Суціным, якога ведаў з дзяцінства (пра гэта аповяд Суціна у кн .: Soutine, Paris, 1959, «Art et Style», с. 52).

У 1925-1940 гг. Зарфін часта выстаўляецца ў Салоне незалежных і ў той жа час працуе як мастак-прыкладнік: па яго эскізах вырабляюць тканіны для сукенак высокай моды. У 1939 г. атрымлівае французскае грамадзянства. У 1941 г. знаходзіць прытулак у Ліёне, затым у Грэноблі; і ў тым, і ў іншым горадзе задавальняе выставы пры падтрымцы захавальніка музея Андрэ Фарсі. Працы, якія ён пакінуў у парыжскай кватэры, бясследна знікаюць. У 1947 г. Зарфін пасяляецца ў Роні-су-Буа. У 1950-я гады яго манера прыкметна эвалюцыянуе, Зарфин ўдасканальвае тэхніку выкарыстання гуашы, змешваючы яе з маслам.

У 1955 г. адно з палотнаў Зарфіна купляе Нацыянальны музей сучаснага мастацтва («Пейзаж», 50 x 64, №24360; згодна з каталогам музея № AM 3353

Р). У 1958 г. праходзіць выстава Зарфіна ў Габрэйскім музеі Нью-Ёрка, у 1964 г. - у Музеі Ашмолеан (Оксфард), у 1966 г. - у замку Лаверсін, недалёка ад Крейля, але ў цэлым Зарфін жыве замкнёна. Тым не менш некаторыя калекцыянеры цікавяцца яго творчасцю. У 1963 г. пад рэдакцыяй Эрнста Фрэнкеля выходзіць калектыўная манаграфія, прысвечаная мастаку; у яе ўвайшлі артыкулы Эцьена Сур'ё, Жана Касу, Вальдэмара-Жоржа і Анры Герца. У 1960-я гады Зарфін часта жыве ў Брэтані і ў ваколіцах Монпелье, а ў пачатку 1970-х - у Савойі.

Зарфін працягваў працаваць да самай смерці ў 1975 г. Яго творчасці было прысвечана некалькі рэтраспектыўных выстаў: у Монтрэ-су-Буа (1975), Манпелье (1980, 1984), Люнеле (1981). Пачынаючы з 1995 г. галерэя «Орэады» (Парыж, Тулуза, Люшоне) рэгулярна ўключае ў свае экспазіцыі працы Зарфіна. Зусім нядаўна Надзін Нісцавер, спецыяліст па «парыжскай школе», таксама стала знаёміць публіку з творчасцю Зарфіна (www.ecoledeparis.org).